# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** Скафандр. Самшыт. Карак. Пава. Пекар. Кара. Агарак. Пломба. Агу. Венік. Мазь. Ракфор. До. Астролаг.

**Па вертыкалі:** Епіскап. Фрак. Ношка. Рэтра. Кораб. Піка. Ворат. Клоўн. Арала. Акунь. Гам. Павязка. Карат. Макао. Згода. Рог.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,** *г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.16 | 16.48 | 7.32 |
| Віцебск — | 9.13 | 16.30 | 7.17 |
| Магілёў — | 9.06 | 16.38 | 7.32 |
| Гомель — | 8.54 | 16.43 | 7.49 |
| Гродна — | 9.30 | 17.05 | 7.35 |
| Брэст — | 9.22 | 17.14 | 7.52 |

## Месяц

*Апошняя квадра 10 снежня.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

## Імяніны

*__Пр.__ Васіля, Георгія, Івана, Ільі, Мікалая, Пятра, Якава.*
*__К.__ Леакадзіі, Наталлі, Яўхіма.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Я захацеў есці і адкрыў піва. Гатаваць не так ужо і складана, не ведаю, чаго там жанчыны скардзяцца.**

Вовачка крычыць са двара маці, якая стаіць на балконе:

— Мама, кінь мне сюды 40 капеек!

— Яны ж рассыплюцца!

— А ты іх у пяць рублёў загарні!..

**За тое, што дзед Васіль умее карыстацца ноўтбукам, равеснікі называюць яго ведзьмаком.**

— Вы хто?

— Я мужчына з вашых фантазій!

— Хм... Чаму адзін?

**Запісаўся на трэнінг «Як не даць сябе падмануць».**

**Дарага, вядома, а што рабіць?**

Жонка — мужу:

— Чаго ж ты, ірад, п'еш непрабудна?!

— Разумееш, мне вараж-бітка наваражыла, што ў наступным жыцці я буду казлом. Так крыўдна!

— Што, ізноў?..

**Мужчына і жанчына маглі б сустракацца вачыма часцей, калі б не дэкальтэ.**




Малюнак Міколы ПІГЕЛЯ.

## Даты | Падзеі | Людзі

### 9 СНЕЖНЯ

*Міжнародны дзень барацьбы з карупцыяй. Абвешчаны па ініцыятыве ААН. 9—11 снежня 2003 года ў мексіканскім горадзе Мерыда адбылася палітычная канферэнцыя высокага ўзроўню, на якой была адкрыта для падпісання Канвенцыя ААН супраць карупцыі.*

**1842** год — нарадзіўся Іван Іванавіч Гольц-Мілер, рускі паэт, удзельнік рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху. У 1859 годзе скончыў Мінскую гімназію. У 1861-м быў арыштаваны як удзельнік рэвалюцыйнага гуртка П. Р. Заічнеўскага. У 1867—1869 гадах жыў у Мінску, падарожнічаў па Расіі. Друкаваўся ў часопісах «Современник», «Отечественные записки». Памёр у 1871 годзе.

**1842** год — нарадзіўся Пётр Аляксеевіч Крапоткін (1842—1921 гады), князь, рускі рэвалюцыянер, тэарэтык анархізму. Аўтар прац па этыцы, сацыялогіі, гісторыі Французскай рэвалюцыі, успамінаў «Запіскі рэвалюцыянера».



**1953** год — нарадзілася (г. Сталіна, УССР) Таццяна Эдуардаўна Краўчанка, савецкая і расійская актрыса тэатра і кіно, народная артыстка Расійскай Федэрацыі. Здымалася ў фільмах «Небяспечна для жыцця», «Нябёсы абяцаныя», «Суччыны дзеці», серыяле «Сваты» і інш.

**1968** год — лічыцца днём нараджэння камп'ютарнай мышы. Менавіта ў гэты дзень амерыканскі вынаходнік Дуглас Энгельбарт са Стэнфардскага даследчага інстытута на канферэнцыі па вылічальнай тэхніцы ў Сан-Францыска прадэманстраваў у рабоце першае падобнае прыстасаванне. Гэтая вынаходка ўяўляла сабой драўляны куб на колцах з адной кнопкай. Сваім імем камп'ютарная мыш абавязаная праводу — ён нагадваў вынаходніку хвост мышы. Унутры прылады знаходзіліся два металічныя дыскі: адзін паварочваўся, калі прыладай рухалі наперад, другі адказваў за рух «мышы» направа і налева. Сёння існуюць два віды камп'ютарных мышэй: механічныя і аптычныя. Апошнія пазбаўлены механічных элементаў, а для адсочвання перамяшчэння маніпулятара адносна паверхні выкарыстоўваюць аптычныя датчыкі.

### Было сказана

**Сяргей ГРАХОЎСКІ, паэт, перакладчык, публіцыст:**

*«Жыві, шукай, усё рабі як след,*
*Каб на Радзіме твой свяціўся след».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4653.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 8 снежня 2017 года.